Младзецкаму было загадана забяспечыць Т. Кроліка ўсім неабходным для сплава («у дарогу па звычаю і патрэбе») і передаць яму ў нагляд («дазор») «і заведванне, як усе тавары, якія накіроўваліся да Рыгі, так і кормнікаў і чэлядзь, каб яму ва ўсім, так як яму самому падпарадкоўваліся». Младзецкі павінен быў накіраваць разам з Т. Кролікам яшчэ двух здольных пастаўскіх мяшчан, якіх бы Кролік сам выбраў для дадзенай працы, выдзяліць ім човен, каб усе тыя спрытней дабраліся да месца знаходжання лясных тавараў і хутчэй даставілі іх да Рыгі. Распараджэнні Т. Кроліку даваў непасрэдна А. У. Радзівіл [2, арк. 70].

Але не ўсё ў гаспадарчай дзейнасці Пастаў ішло належным чынам. Так, па паперах асабістай перапіскі А. Радзівіла з А. Младзецкім у лісце ад 1 сакавіка 1631(?) г. Радзівіл здзіўляўся, што з Пастаўскай і Полаўскай воласці не даваліся падводы для вывазу лясных тавараў на бераг – «пакуль трывае санная дарога» [2, арк. 87].

Аб злоўжываннях пры нарыхтоўцы лясных тавараў сведчаць скаргі на Младзецкага падданых Пастаўскага маёнтка. Адна з такіх скарг была пададзена А. У. Радзівілу ў Смаргоні 19 сакавіка 1635 г.: пастаўскія і полаўскія падданыя скардзіліся на полаўскіх ляснічых Гестара і Стахоўскага, што тыя спусташалі пушчы і вырабілі вялікай клёпкі па 1 тыс зл, а меншай на 3 тыс.зл; спецыяльна, з умыслу спілілі і спалілі 90 дубоў, прыгодных для вырабу борцяў, а з пчоламі было знішчана 10 дубоў, пры чым павыбіралі мёд з воскам. Падданыя скардзіліся на буднікаў двух буд, што тыя свавольна вырубалі ліпу. Ад чаго сялянам была шкода, так як найлепшы мёд атрымоўваўся менавіта з ліп, як і з ліпы атрымоўваўся якасны попел (за тое быў пакараны ляснічы Нестар – яго прыгаварылі да біцця пастронкамі. Ляснічых Младзецкага абвінавачвалі ў «выдранні» (знішчэнні) двух дворных борцяў з пчоламі, а пасля «п'янымі буднікамі» яшчэ 10 дворных вулляў [2, арк. 95].

У цэлым, дакументы адносна гандлю ляснымі таварамі 30-х гг. XVII ст. з маёнтка Паставы прадстаўлены разнастайнымі крыніцамі: дамовамі аб працы, квітанцыямі аб атрыманні грошаў, тавараў з маёнткаў, паперамі асабістай перапіскі, рэестрамі даходаў і расходаў, скаргамі падданых на лясных рабочых і інш. Дадзеныя крыніцы аднаго маёнтка даюць ўяўленне пра правілы і механізмы арганізацыі працы па вырабу і гандлю ляснымі таварамі, пра ход дадзеных работ, схемы расходвання сродкаў, атрыманых ад дадзенага гандлю.

1. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2001. – 688 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў. – Ф. 694. Воп. 4. Спр. 2026.
3. Hedemann, O. Dawne puszcze i wody / O. Hedemann. – Wilno : Księgarnia św. Wojciecha, 1934 – 187 s.

**Субоцін А.А.**

## КЛІМАТЫЧНЫЯ З'ЯВЫ XVII ст. НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ ВА "УСПАМІНАХ" АЛЬБРЭХТА СТАНІСЛАВА РАДЗІВІЛА

*Ключавыя словы: ВКЛ, клімат, надвор'е, гістарычная кліматалогія, мемуарная літаратура.*

Пры рэканструкцыі клімату мінулых стагоддзяў, калі адсутнічалі інструментальныя метэаралагічныя даследаванні, асаблівую каштоўнасць маюць такія пісьмовыя крыніцы, як дзённікі і мемуары, якія дазваляюць ахарактарызаць стан надвор'я па ўласных назіраннях іх аўтараў. Яскравым прыкладам мемуарнай літаратуры Рэчы Паспалітай XVII ст. выступае твор "Успаміны пра падзеі ў Польшчы", запісаны канцлерам вялікім літоўскім Альбрэхтам Станіславам Радзівілам. "Успаміны" ўяўляюць сабой дзённікавыя запісы, зробленыя ў прамежак часу з 1632 г. да 1656 г., дзе

апавяданне хаця і адбываецца па канкрэтных датах, але часта выходзіць за ўказаныя храналагічныя рамкі, і аўтар можа апісваць падзеі ранейшыя па часе або ў цэлым распавядаць пра факты цэлага месяца, што характарызуе гэты твор як дыярыуш з элементамі мемуараў. Сярод грамадска-палітычных, рэлігійных, культурных падзей Рэчы Паспалітай і фактаў з асабістага жыцця Радзівіл у сваім творы часта звяртаў увагу і на стан надвор'я, якое ён фіксаваў не толькі на тэрыторыі Польшчы, Украіны, але і калі знаходзіўся ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Першыя запісы, зробленыя ва "Успамінах пра падзеі ў Польшчы", датычыліся як раз кліматычных умоў. Альбрэхт Станіслаў Радзівіл пачаў сваё апавяданне з таго, што зіма 1631/1632 гг. была няўстойлівай і зменлівай. У гэты час у наваколлях Пінска ў студзені 1632 г. ад працяглых дажджоў дарогі сталі небяспечнымі для пераездаў, бо разліліся рэкі і падтаялі балоты, якімі быў багаты адзначаны рэгіён. Аднак у адну з начэй месяца надвор'е рэзка стала марозным. Гэта дазволіла Станіславу Альбрэхту выправіцца са сваім братам Жыгімонтам Каралем Радзівілам і вялікай працэсіяй з Нясвіжа ў Пінск на соймік, які мусіў адбыцца 20 студзеня [3, s. 101].

Наступны па храналогіі запіс, які можа ахарактарызваць кліматычныя ўмовы на тэрыторыі ВКЛ, і ў прыватнасці ў Беларусі, быў занатаваны Альбрэхтам Станіславам Радзівілам пад 1633 г. У гэты год 20 мая кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV паляваў пад Гродна. Пры гэтым аўтар "Успамінаў" адзначыў, што моцны вецер, які ўзняўся ва ўзгаданы дзень, не перашкодзіў каралеўскім ловам, і манарх быў на паляванні да вечара [3, s. 307].

Летам 1633 г. Уладзіслаў IV збіраўся прыбыць у Вільню для прыняцця прысягі перад феадаламі ВКЛ у сувязі са сваім уступленнем на прастол. Ва "Успамінах" Радзівіла апісанні адзначанай падзеі суправаджаліся таксама асобнымі згадкамі пра ўмовы надвор'я. Так, 17 чэрвеня дэлегацыя караля, у складзе якой, відаць, знаходзіўся і Альбрэхт, на шляху ў сталіцу ВКЛ вымушана была прыпыніцца ў Мерачы з-за таго, што многія коні стаміліся ад летняй спёкі [3, s. 309]. Мяркуючы па далейшым апавяданні "Успамінаў", гарачае надвор'е змянілася ў канцы месяца надыходам дажджоў, і 24 чэрвеня, у дзень прызначаны для ўезду караля ў Вільню, працэсія гараджан трапіла пад такі моцны лівень, што не змагла прадэмастраваць сваё парадное адзенне і ўпрыгожванні. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, сустрэча караля ўсё ж адбылася за мілю ад Вільні, і Уладзіслаў IV змог урачыста ўехаць у горад [3, s. 310–311].

Пад датай 29 кастрычніка 1633 г. Альбрэхт Станіслаў Радзівіл, знаходзячыся ў Нясвіжы, зрабіў запіс пра наступную незвычайную прыродную з'яву: "Глядзець на гэты дзень было страшна, таму што, калі ён надыйшоў, можна было бачыць, не без жаху, як сонца то чырванее, то зацямняецца чырвонымі хмарамі, то святлее" [3, s. 335]. Такі стан неба назіраўся на працягу амаль двух дзён, і, па вызначэнні аўтара "Успамінаў", толькі дзякуючы працяглым малітвам удалося дачакацца ўсталявання нармальнага надвор'я [3, s. 335]. Як бачым, у светасузіранні людзей XVII ст. яшчэ захоўвалася ўспрыманне прыродных працэсаў і кліматычных зменаў як праяўленняў волі Бога або дзеяння звышнатуральных сілаў, на якія можна падзейнічаць адраўленнем культавых абрадаў.

Агульную кліматычную характарыстыку Альбрэхт Станіслаў Радзівіл даў маю наступнага 1634 г., калі занатаваў, што гэты месяц быў адзначаны багаццем вятроў і пажарамі многіх гарадоў [3, s. 377]. Такое апісанне паказвае на ўсталяванне сухога і цёплага надвор'я, якое, як мы мяркуем, мемуарыст адносіў і да тэрыторыі Польшчы, і да тэрыторыі ВКЛ. Гэта часткова працвярджаюць і дэндрахраналагічныя дадзеныя, акумаляваныя ў Атласе засух Старога Свету і Атласе засух Еўрапейскай Расіі, калі за вегетацыйны перыяд 1634 г. сярэдні індэкс вільготнасці па шкале Палмера апусціўся да -4, што адпавядае экстрымальна сухому надвор'ю [2; 5].

Кароткія звесткі пра кліматычныя ўмовы можна сустрэць ва "Успамінах" пад 1636 г. 5 сакавіка Радзівіл распавёў пра ўезд караля ў Вільню без урачыстых цэрымоній на санях [3, s. 520]. Апошняя невялікая акалічнасць тым не менш дае нам інфармацыю пра наяўнасць вялікага снежнага покрыву і халоднае надвор'е ў пачатку вясенняга сезона.

Наступны метэаралагічны запіс, які адносіўся да ВКЛ, зроблены ва "Успамінах" толькі пад 1647 г., калі былі адзначаны экстрымальныя з'явы ва ўладаннях Альбрэхта Станіслава Радзівіла ў Беларусі. 13 чэрвеня ў адным з яго маёнткаў ад удару маланкі загарэўся дом, і агонь не распаўсюдзіўся далей толькі дзякуючы праліўному дажджу. Неспрыяльнае надвор'е з маланкамі, ліўнямі і парывістымі вятрамі панавала ў гэты дзень, па словах літоўскага канцлера, на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У прыватнасці, аўтар "Успамінаў" апісаў падчас дадзенай непагадзі з'яўленне ў Нясвіжскім замку нібыта цялегі, запрэжанай коньмі, што кацілася па двары. Можна меркаваць, што гаворка магла ісці пра шаравую маланку, вобразна прадстаўленую Радзівілам. Таксама ён адзначыў, што маланкі двойчы трапілі ў замак, пашкодзілі Нясвіжскі касцёл Божага Цела. Пасля ўпамінання прыроднага катаклізму мемуарыстам былі зроблены апісанні наступстваў стыхіі: з-за працяглых ліўняў адбыліся значныя паводкі і прарыў грэбляў, што адпаведна прывяло да знічшэння пасеваў і сур'ёзных эканамічных страт [4, s. 45].

Асобную характарыстыку на аснове "Успамінаў" мы можам даць зімняму сезону 1647/1648 гг. У запісах за снежань 1647 г. было пакінута наступнае сведчанне: "Я спяшаўся да двара і з вялікімі цяжкасцямі перапраўіўся па недастаткова скаванай льдом рацэ да Пінска" [4, s. 56]. Гэтае апісанне паказвае, што ў пачатку зімы на тэрыторыі паўднёвай Беларусі назіралася няўстойлівае надвор'е з частымі адлігамі, якія прывялі да таго, што рэкі на асобных участках не пакрыліся дастатковай таўшчынёй лёду, здатнай для перамяшчэння па ім на санях. Падобнае ж па змесце апісанне Альбрэхт Станіслаў Радзівіл пакінуў і пра студзень 1648 г., калі адзначаў, што кароль Уладзіслаў IV меў намер прыехаць у Літву, але з-за таго, што рэкі тут недастаткова замерзлі і пачалі ісці дажджы, адклаў сваю паездку. Паездка караля і яго жонкі ў ВКЛ адбылася толькі ў пачатку вясны, калі 19 сакавіка яны, па сведчанні Радзівіла, уехалі на санях у Вільню. У гэты дзень у горадзе ўсталявалася яснае, але з моцным марозам, надвор'е [4, s. 66, 70]. У выніку можна лічыць, што зіма 1647/1648 гг. была адносна цёплай з частымі адлігамі, і нават дажджамі, што паказвае на няўстойлівасць лёдовага покрыву на рэках. Халады пры гэтым вяртаюцца ў сакавіку, калі назіралася марознае надвор'е з характэрна высокім узроўнем снежнага покрыву. Для параўнання, падобную ж характарыстыку адзначанага сезона на тэрыторыі Польшчы і ВКЛ даў райца горада Казіміра (прадмесце Кракава) Марцін Галінскі ў сваім зборніку дакументаў і навін "Silva rerum", дзе пад 1648 г. было занатавана: "Зіма была няўстолівай: то амаль не было маразоў, то толькі невялікія замаразкі, то дажджы" [1, s. 3].

Апісанне чарговай экстрымальнай кліматычнай з'явы было зроблена Альбрэхтам Станіславам Радзівілам 20 мая 1649 г. У гэты дзень, знаходзячыся ў гасцях у віленскага ваяводы Крыштафа Хадкевіча ў фальварку недалёка ад сталіцы ВКЛ, ён упамінуў пра жахлівыя грымоты. У самой Вільні ў гэты час ад маланак загінула некалькі чалавек і адбыўся пажар у збудаваным касцёле святога Аўгусціна [4, s. 198].

Апошняе па храналогіі сведчанне пра кліматычныя ўмовы на тэрыторыі ВКЛ, занатаванае ва "Успамінах", адносіцца ўжо да часоў праўлення караля Яна Казіміра. У запісах пра люты 1653 г. Альбрэхт Станіслаў апавядае, што манарх знаходзіўся ў Гродна, а далей выправіўся ў Кобрын, дзе сустрэўся з войскамі Рэчы Паспалітай і меў намер адтуль сам накіравацца ў паход супраць казакоў на тэрыторыю Украіны, але, па меркаванні Радзівіла, адмяніў свой удзел у баявых дзеяннях з-за ўнутраных супярэчнасцей у ваенным лагеры, а таксама з-за зменлівай і няўстойлівай зімы [3, s. 376]. З гэтага вынікае, што люты 1653 г. характарызаваўся адстунасцю моцных

халадоў і частымі наступленнямі пацяплення, што зноў-такі не далі замерзнуць рэкам, па якіх пераважна і праходзіла перамяшчэнне ў зімні сезон.

Такім чынам, “Успаміны” Альбрэхта Станіслава Радзівіла можна лічыць адной з каштоўнейшых пісьмовых крыніц, якая прадстаўляе інфармацыю пра кліматычныя ўмовы XVII ст. на тэрыторыі ВКЛ, і ў прыватнасці Беларусі. Літоўскі канцлер, выступаючы ў якасці мемуарыста, зрабіў характэрныя для свайго часу запісы. Як і іншыя аўтары XVII ст., ён засяродзіў увагу на экстрымальных кліматычных з’явах, сярод якіх вылучаюцца маланкі, праліўныя дажджы, моцны вецер і незвычайнае становішча нябеснай сферы. Пры гэтым аўтар “Успамінаў” зрабіў спробу даць агульную характарыстыку надвор’я ў асобныя месяцы або сезоны апісаных ім гадоў. Так, на аснове дадзенай апавядальнай крыніцы мы можам меркаваць пра няўстойлівае і пераменнае надвор’е ў Беларусі зімой 1631/1632 гг., 1647/1648 гг., у лютым 1653 г., сухое надвор’е ў маі 1634 г. Адзначаныя факты запаўняюць пэўныя прабелы ў нашых ведах пра метэаралагічнае мінулае Усходняй Еўропы і даюць інфармацыю, якую мы не можам сустрэць у папярэдніх даследаваннях па гісторыі клімату.

1. Namaczyńska, S. Kronika klęsk elementarnych w Polsce i w krajach sąsiednich w latach 1648–1696. 1. Zjawiska meteorologiczne i pomory / S. Namaczyńska. – Lwów : Skł. gł. Kasa im. rektora J. Mianowskiego, Instytut Popierania Polskiej Twórczości Naukowej, 1937. – 234 s.

2. Old World Drought Atlas // National Centers for Environmental Information. – URL: https://www.ncei.noaa.gov/access/paleo-search/study/19419 (date of access: 07.03.2025).

3. Radziwiłł, A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce / A. S. Radziwiłł. – T. 1 : 1632–1636. – Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1980. – 603 s.

4. Radziwiłł, A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce / A. S. Radziwiłł. – T. 3 : 1647–1656. – Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1980. – 645 s.

5. The European Russia Drought Atlas (ERDA) Reconstruction of PDSI from 1400–2016 CE // National Centers for Environmental Information. – URL: https://www.ncei.noaa.gov/pub/data/paleo/drought/cook2020-erda/visualizations (date of access: 07.03.2025).

**Ерохин В.Н.**

## ТРУДЫ РИЧАРДА ХУКЕРА КАК ИСТОЧНИК ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ СТАНОВЛЕНИЯ ДОКТРИНЫ ЦЕРКВИ АНГЛИИ

*Ключевые слова: Реформация в Англии, Церковь Англии, кальвинизм, пресвитерианство, пуританизм, англиканство, Ричард Хукер.*

В изучении истории Реформации в Англии важной задачей является рассмотрение процесса приобретения Церковью Англии собственной идентичности среди европейских протестантских церквей. В формировании идейной основы для английской Реформации определяющую роль сыграли лютеранство и впоследствии ставший для нее наиболее значимым кальвинизм. В 1560-е гг. стало оформляться пуританское движение, деятели которого пропагандировали церковное переустройство в стране по кальвинистскому женевскому образцу. Это столкнуло пуритан с королевской властью, поскольку женевская пресвитерианская система церковного управления не предполагала в управлении церковными делами никакого места для королевской власти. В Англии же начало Реформации в 1534 г. ознаменовалось провозглашением монарха в парламенте главой Церкви Англии, так что цели, пропагандировавшиеся пуританским движением в Англии, оказались неконституционными. Для английских пуритан характерно было также стремление моделировать церковную жизнь в стране в максимальной степени на основе требований Священного Писания, что тоже оказывалось неприемлемым в условиях, когда протестантская Церковь Англии конституировалась как структура, которую возглавлял монарх. Пуританская религиозно-культурная традиция внесла в